этнамастацкай беларускай адукацыі ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Як паказаў час, мы змагаліся не дарэмна: «атрымаўшы па лапах» ад тагачаснага Міністэрства культуры, суполка-пачвара пачала «кусаць і рваць на кавалкі» сябе саму, і працэс доўжыцца, што не дзіўна, улічваючы інтэлект, кваліфікацыю ды мараль гэтых «культурных дзеячаў». Шэраг фігурантаў тых падзей (ня гледзячы на часова высокія пасады) былі імкліва выціснуты з дзяржаўнай сферы і сацыяльнага жыцця краіны, а частка – яшчэ, без сумніву, знойдзе дастойны сваіх «подзвігаў» лёс. Дзякуючы нашай прынцыповай пазіцыі, сёння, напачатку 2020 г., мы назіраем працэс імклівага афармлення навукова-практычнай школы айчыннай *ужытковай культурнай антрапалогіі* ці яе першага напрамку – *сацыякультурнай антрапалогіі традыцыйнага мастацтва*, якую ўтвараюць вучні нашыя, нашых калег і аднадумцаў (У. Конана, З. Мажэйкі, Т. Варфаламеевай, М. Козенкі, Я. Грыгаровіч, Г. Кутыровай-Чубалі, У. Зяневіча, М. Грынчыка, В. Лабачэўскай, Р. Кавалёвай, А. Боганевай), а таксама іх выпускнікі, якія непасрэдна працуюць з культурнай спадчынай краіны XXI ст.

Вывучэнне асаблівасцей нематэрыяльнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі, унікальных сваім гістарычным маштабам, інтэнсіўнасцю і глыбінёй уплыву на ўсю культурную творчасць, бясспрэчна, належыць да найважнейшых праблем пераемнасці і культуры. Засваенне культурнага фонду мінуўшчыны сёння характарызуецца тым, што перавагу набываюць не стылявыя і фармальныя рысы мінулай культуры, а яе суцэльнае і ўсебаковае асэнсаванне з той мэтай, каб суб’ект гэтага асэнсавання мог зразумець сябе арганічнай часткай адзінага культурастваральнага руху гісторыі.

Разам з тым рэзка ўздымаецца значэнне спадчыны вуснай традыцыі ў грамадскім жыцці, узрастае роля навуковага асэнсавання спадкаемнасці культуры, расце ўзровень свядомай дзейнасці людзей у засваенні традыцыйных культурных каштоўнасцей. У выніку прымянення сродкаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі павялічваецца магчымасць расшыфроўкі найбольш глыбінных культурных пластоў мінуўшчыны, цэлых культурных эпох, з’яўляюцца спосабы рэканструкцыі, рэпрадукцыі культурных скарбаў мінуўшчыны.

Ва ўмовах глабалізацыі каштоўнасці і дасягненні толькі тэхнагеннай цывілізацыі, якія б вялікія яны ні былі, не здольныя забяспечыць адэкватнае, усеабдымнае навуковае спасціжэнне спадчыны культуры для выжавання чалавецтва. У сувязі з гэтым сёння асабліва востра паўстае пытанне аб стварэнні ў Беларусі прадуманай канцэпцыі сацыяльных, палітычных, псіхалагічных і культурных умоў спазнання, трансляцыі, забеспячэння ўжытковага (жыццёвага, побытавага) функцыянавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая невынішчальная са структуры яе сучаснай культуры.

**Спіс літаратуры:**

1. Дорошевич, Э. Миф как явление культуры / Энгельс Дорошевич, Павел Мартысюк // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 25–26.03.2003). – Мінск : БДУК, 2003. – С. 55–63.
2. Итс, Р. Введение в этнографию / Рудольф Итс. – Л. : Изд-во Ленинград. ун-та, 1974. – 160с.
3. Дубавец, С. Вострая брама : беларускі культурны кантэкст на мяжы стагоддзяў / Сяргей Дубавец. – Мінск : РСЭ / РС, 2005. – 519 с.
4. Калацэй, В. Велікодная абраднасць у святле тэорыі камунікацыі: пытанні міжкультурнага кантэксту святаў першай веснавой поўні / Вячаслаў Калацэй // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 25–26.03.2003). – Мінск : БДУ культуры, 2003. – С. 309–313.

***Вячаслаў Калацэй***

## НАБЛІЖАЮЧЫ ДАЛЁКАЕ: PATRIMONIO INTELLETTUALE ЭНГЕЛЬСА ДАРАШЭВІЧА (*26.10.1931–14.02.2020*)

*У артыкуле структурна прамаляваны абрыс інтэлектуальнай спадчыны доктара філасофскіх навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Э. Дарашэвіча. Аўтар адсочвае, якім чынам у розныя часы шэрагам друкаў Э. Дарашэвіч прааналізаваў па этапах, фактычна, асноўныя лініі ўсяго вядомага навуцы «акультуранага» антрапагенеза, а яго тэксты складваюцца ў паслядоўную і цэласную канцэпцыю разумення тыпалогіі культуры Беларусі як стандартнай «хрэстаматыйна-еўрапейскай» краіны ў глабальным кантэксце. Прычым «навігатарам» па антагенезу краіны і яе народа ў часе і прасторы з’яўляецца спадчына вуснай традыцыі яе тытульнага этнасу.*

***Viachaslau Kalatsei***

## APPROACHING DISTANT: PATRIMONIO INTELLETTUALE BY ENGELS DARASHEVICH (*26.10.1931–14.02.2020*)

*The article structurally outlines the intellectual heritage of Ph. D., laureate of the State Prize of Belarus E. Darashevich. The author traces how at different times E. Darashevich analyzed the main lines of all known to science «cultured» anthropogenesis in stages, and his texts form a consistent and holistic concept of understanding the Belarusian culture typology as a standard «European textbook» country in a global context. And they are a «navigator» of the country ontogeny and its people in time and space is the legacy of the oral tradition of its titular ethnos.*

*Ты сделал меня другом тех, кого не знал я прежде. Ты ввел меня в жилища, доселе мне чуждые. Ты приблизил далекое и чужого сделал мне братом. Мне тяжело покидать привычный кров; я забываю, что в новом живет старое и что ты всюду со мной.*

– Рабіндранат Тагор [8, с. 47]

Культуралогія ў далёкія 1990-я гады рабіла першыя і, трэба адзначыць, досыць кульгавыя крокі па постсавецкай акадэмічнай прасторы, аднак мае калегі і калежанкі – студэнты музычнага факультэта Беларускага ўніверсітэта культуры – даволі «роўненька цягнуліся» на лекцыі па ёй а 8-й раніцы ў пятніцу ці ў суботу, бо лектарам быў Энгельс Дарашэвіч. Сам ён заўжды лічыў сябе перадусім дасведчаным і стромкім гісторыкам навукі, мабыць таму ў новай на той час дысцыпліне, якая інтэгратыўна яднала філасофію, гісторыю, сацыялогію, эканамічную тэорыю і мастацтвазнаўства, меўся «нібыта рыба ў вадзе». І мы, пасля тыдня гам і арпеджыа, выканаўчых трэнінгаў і дырыжыравання, разам з прафесарам гіпнатычна танулі

ў «Заняпадзе Захаду» Освальда Шпэнглера, праз «выклік і адказ» спасцігалі гісторыю з Арнольдам Тойнбі, шукалі метафізічныя асновы сусвету паводле Рэнэ Генона ды дыскутавалі, пра што размаўляў Францішак Скарына з Марцінам Лютэрам і Парацэльсам. Сёння шмат маіх знаёмых разважаюць: у чым прыцягальнасць і сакрэт асобы Э. Дарашэвіча; чаго ў ім было больш – харызмы, інтэлекту ці выхаванасці; што лічыць яго сапраўднай спадчынай – ідэі і канцэпцыі, стос манаграфій, ці шэраг вучняў і паслядоўнікаў? Магчыма, час дакладных адказаў на гэтыя пытанні яшчэ не надышоў; магчыма, для кожнага з запытаўшых яны будуць свае, індывідуальныя; магчыма, адказы будуць мяняцца, як часам вельмі імкліва мяняўся на вачах субяседнікаў настрой паважанага прафесара (мал. 1).


Малюнак 1 – Э. Дарашэвіч. НАН Беларусі, 2016



Малюнак 2 – Сумесная манаграфія з У. Конанам


Малюнак 3 – У. Конан і Э. Дарашэвіч на навуковай імпрэзе, 1970-я гг.

Найбольш сенсітыўныя даследчыкі-гуманітарыі, да якіх, па агульным меркаванні, бясспрэчна належыў Э. Дарашэвіч, заўсёды адчувалі неабходнасць комплекснага вывучэння культуры з прычыны яе велізарнай ролі ў структуры кожнага грамадства. Наша ж ы ц ц ё (як жыццё людзей), калі не ўлічваць прыродны асяродак, які вывучаюць прыродазнаўчыя навукі – гэта: a) *мы*; b) *людзі, якія нас абкружаюць*; c) *стасункі, у якія мы з імі ўваходзім*. К у л ь т у р а (*агульнапрынятыя ў пэўнай супольнасці формы арганізацыі мыслення і паводзін* [2, с. 26]) існуе паўсюль, дзе ёсць людзі і ўзаемаадносіны паміж імі. Маючага сапраўды эпічна-трагічны жыццёвы досвед (кам. 1), а таксама прыродную назіральнасць і цікаўнасць да наваколля, Э. Дарашэвіча заўсёды хвалявала праблема тыпалогіі і тэзаўрыравання культуры людзей, якія яго абкружалі. Імаверна, можна шмат казаць пра яго лінгвістычны талент паліглота, захапленне самымі абстрактнымі ўніверсаліямі, экуменізмам і глабальным пацыфізмам, але (прымаючы ці не прымаючы да ўвагі яго выказванні розных часоў ды ігнаруючы ксенафобію, яму не ўласцівую) варта адзначыць: нават глабальныя рэчы ён успрымаў перадусім праз рэаліі, гісторыю, сацыяльны досвед, сувязі ды лёсы ўраджэнцаў сваёй Радзімы – Беларусі. Аналіз Э. Дарашэвіча быў неперадузяты, бо перманентныя пафас і заангажаванасць нейкай асобнай ідэалогіяй ці навуковай ідэяй-фікс яго абмінулі пад націскам жыццёвага досведу (які пазбавіў ад ілюзій і забабонаў), а светасузіранне склалася ў арыентаваную на рэаліі зменлівай навакольнай рэчаіснасці і дынамічнасць навуковых парадыгм гнуткую сістэму. У ёй перакрыжаваліся часам супярэчлівыя і стракатыя складовыя, «рэактывы» і «каталізатары». Але вынік працы гэтай сістэмы даваў якасную і функцыянальную «эсенцыю» – аналітычнае разуменне працэсаў, што адбываюцца (адбываліся / будуць адбывацца) у навакольным грамадстве (да чаго, уласна кажучы, і імкнецца гуманітарная навука), «аб’ектыўную ісціну …» [5, с. 6].

Пачатак навуковай кар’еры Э. Дарашэвіча прыпадае на часы «адлігі» 1960-х, і перакананым «шасцідзесятнікам» (антытаталітарыстам; вельмі кплівым да непісьменнасці, асабліва непісьменнасці «н а ч а л ь н и к а», ці пазней – «кіраўніка», прафесіяналам; нягучным, але стромкім ідэялістам і носьбітам перманентнага супрацьстаяння відавочнай несправядлівасці) ён застаўся назаўжды. Пасля была адданая (мо, і не зусім удзячная з боку нейкіх «начальников», пра якіх ўсе даўно забыліся) праца ў акадэмічных навукова-даследчых установах (1970–1990-я гг.), а таксама паспяховая педагагічная і навуковая дзейнасць у 2000–2020-я гг. ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Менавіта ва ўніверсітэце ён стаў прафесарам (тагачасны рэктар Я. Грыгаровіч, прафесійны псіхолаг і педагог, пракаментавала дадзеную акалічнасць: «Ваша прафесарства ў нас – наш гонар»), агульнапрызнаным «патрыярхам» мясцовага савета па абароне дысертацый па культуралогіі і мастацтвазнаўстве, паспяховым кіраўніком аспірантаў і бліскуча абараніўшыхся кандыдатаў навук (сярод іх быў шэраг даволі нестандартных асоб, напрыклад: беларускамоўная жонка перакладчыка французскай амбасады ў Беларусі, сірыец-копт, першы дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУКМ).

Афіцыйная навука лічыць Э. Дарашэвіча адным з прадстаўнікоў айчыннай ш к о л ы г і с т о р ы к а-ф і л а с о ф с к і х д а с л е д а в а н н я ў, да якой таксама адносяць Сямёна Падокшына, Уладзіміра Конана і Альфрэда Майхровіча. У значнай ступені намаганнямі гэтых даследчыкаў беларуская савецкая гуманітарыстыка (у свядомасці мясцовай аўдыторыі, якая даследавала, чытала ды разважала) пазбавілася т. зв. ідэалагічнага прэсінгу ды правінцыяналізму, што ўнесла шмат плёну ў культурнае жыццё нашай краіны напрыканцы XX ст., стварыла перадумовы для незацятага дакладнага самавызначэння і ідэнтыфікацыі інтэлектуальнай эліты беларусаў перыяду чарговай плыні беларусізацыі 1990-х, а таксама суверэнітэту 1991 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Малюнак 4 – Калектыўная манаграфія па гісторыі педагогікі Беларусі ад Рэнесансу да кан. XX ст., 1986




Малюнак 5 – Калектыўная манаграфія па спадчыне айчыннай культуры ад часоў міфапаэтычнай традыцыі, 2001




Малюнак 6 – Дапаможнік па фальклоры з аналізам генезісу і інтэнцый постфальклору XXI ст., 2016

На досвітку фарміравання дадзенай школы бліскучым стартам кар'еры Э. Дарашэвіча стала сумесная праца з адным з найвыбітных філосафаў нашай краіны У. Конанам – «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» (мал. 2), якая дала эпічную тысячагадовую панараму станаўлення айчыннай культуры ад хрысціянізацыі першых княстваў Беларусі да пачатку XX ст., а таксама акрэсліла яе прыярытэты і перыядызацыю. Дзякуючы гэтай кнізе, айчынная культура і мастацкая спадчына гістарычных часоў былі недвухсэнсоўна ўведзены ва ўсходнееўрапейскі і нават у еўразійскі навуковы абарот (паколькі манаграфія была выдадзена на рускай мове маскоўскім выдавецтвам «Искусство» у часы СССР). Выданні, неўзабаве падрыхтаваныя з удзелам Э. Дарашэвіча, прысвечаны гісторыі айчыннай педагагічнай думкі (мал. 4), заканамернасцям і персаналіям Асветніцтва на беларускіх тэрыторыях. Яны фактычна таксама працягнулі ўдакладненне месца беларускай культуры Новага часу ў асяродку інтэлектуальнай і мастацкай спадчыны народаў Еўропы. Пошук генетычных асноў айчыннага культурна-мастацкага матэрыялу гістарычных часоў, прааналізаваны ў «Нарысе…», падштурхнуў Э. Дарашэвіча звярнуцца да кроскультурных і арыентаваных на этапы старажытнай гісторыі Беларусі (яе *прымардыяльную,* па перакананні прафесара, традыцыю [6, с. 9]) даследаванняў у «Культурнай спадчыне» (мал. 5), дзе ім і яго вучнямі асвятляліся пытанні: вылічанай з пазіцый маскоўска-тартускай школы структурнай лінгвістыкі структуры міфалогіі беларусаў [6, с. 36–42], вытокаў айчыннага вальнадумства і пошукаў сацыяльнай справядлівасці эпох Рэнесансу і Асветы [6, с. 79–84], а таксама навейшых інтэнцый постмадэрнізму актуальнага мастацтва краіны [6, с. 102–105] і базавага значэння культурнай спадчыны ў «структурах паўсядзённасці» народа [6, с. 79–84]. Наступнае выданне «У тэзаўрусе Беларусі» (2011), якое з'явілася плённай данінай павагі і ўдзячнасці Э. Дарашэвічу з боку шырокага кола сяброў, калег і вучняў і прысвечана яго 80-гадоваму юбілею, акрэсліла непасрэдную ўвагу да традыцыйнай культуры, паколькі з 2009 г. ён стаў штатным прафесарам кафедры этналогіі. Метадалагічны талент і эрудыцыя даследчыка праявіліся ў «Тэорыі фальклору» (мал. 6, 8), над якой Э. Дарашэвіч працаваў у 2009–2015 гг. Добрую глебу для стварэння гэтай кнігі вызначыла даўняе супрацоўніцтва Э. Дарашэвіча з «легендай» беларускай аўдыявізуальнай антрапалогіі Зінаідай Мажэйка. Увогуле, у нашым успрыманні навуковая спадчына У. Конана, Э. Дарашэвіча і З. Мажэйкі – своеасаблівы «краевугольны камень» навуковай беларусістыкі (менавіта навуковай, а не багемнай – у тагачаснай і сённяшняй мінскай багемы, у тым ліку і калянавуковай, свае «іконы густу», якіх Э. Дарашэвіч асабіста ведаў, але не прымаў) перыяду постсавецкага «параду суверэнітэтаў». Не дзіўна, што гэтых трох даволі розных асоб усё жыццё яднала ўзаемапавага, адзінадумства і салідарнасць (мал. 7). А надзвычай своечасовы дапаможнік па тэорыі фальклору (якой, як навукова абгрунтаванай канцэпцыі, да гэтага выдання ў айчыннай навуцы не існавала) парадыгмальна падсумаваў і перафармуляваў мэты, задачы, прафесійныя абавязкі і контуры сацыяльнай базы дзейнасці тагачасных студэнтаў Э. Дарашэвіча – фалькларыстаў Беларусі XXI ст. [4, с. 54–61]. Магчыма, таму дапаможнікам дагэтуль з задавальненнем карыстаюцца ў БДУКМ і іншых профільных навучальных установах. Пачынаецца «Тэорыя…» цытатай канцлера Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Іахіма Храптовіча, прысвечанай фальклору [4, с. 8], што канцэптуальна «нітуе» аксіялогію і эстэтыку айчыннай традыцыйнай культуры з ідэалогіяй фарміравання рэнесансных еўрапейскіх нацый, распаўсюджанай сярод носьбітаў светапогляду і эстэтыкі літвінізму і краёўства – «бацькоў-заснавальнікаў» самой ідэі суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. Гэтая ідэя тройчы матэрыялізавалася цягам XX ст.: у 1918, 1920 ды 1991 гг. У фінале манаграфіі – падрабязны (выкананы па ўсіх правілах культурнай антрапалогіі) аналіз маладзёжнага фальклорнага руху часоў мілленіума, які Э. Дарашэвіч адным з першых у краіне абазначыў як постфальклор [4, с. 8].

Калі казаць пра маштаб пэўнага даследчыка і яго ўнёсак у развіццё навукі, разбіраючы patrimonio intellettuale (*лац.* «інтэлектуальная спадчына»), варта абазначыць крытэрыі, па якіх вымяраецца гэты ўнёсак. Паколькі Э. Дарашэвіч лічыў сябе перадусім гісторыкам навукі і з улікам таго, што шэраг інтэлектуалаў напрамкі ці ўскосна канстатуюць адсутнасць сур'ёзнага сусветнага кантэксту ў сучасным беларусазнаўстве (з беларускіх выданняў 2010-х гг.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

присвечаных, напрыклад, гісторыі айчыннай філасофіі і 500-годдзю беларускага першадрукарства, ён шчыра здзекваўся), падаецца, што дакладнае в ы з н а ч э н н е   м е с ц а  Э. Д а р а ш э в і ч а  ў  г у м а н і т а р ы с т ы ц ы (няхай і на першасным, структурным узроўні) дапаможа ўдакладніць *храналагічны зрэз даследавання культурных з'яў паводле яго асноўных манаграфій* (таб. 1). Шэраг іх прысвечаны менавіта беларусістыцы (абмежаванай думкамі і дзеяннямі продкаў дзевяці з палавінай мільёнаў сучасных жыхароў  на 207, 5 тысяч квадратных кіламетраў на ўсходзе Еўропы, а таксама – думкамі і дзеяннямі саміх гэтых жыхароў – грамадзян суверэннай унітарнай Беларусі).


Малюнак 7 – З. Мажэйка і Э. Дарашэвіч на прэзентацыі кнігі, прысвечанай 50-годдзю навуковай і творчай дзейнасці даследчыцы з эпіграфам У. Конана. Бібліятэка НАН Беларусі, 2014



Малюнак 8 – Калектыўная манаграфія з першай рэдакцыяй «Тэорыі фальклору», 2011


Малюнак 9 – Э. Дарашэвіч на фотасесіі для сайта БДУКМ, на левай руцэ – пярсцёнак Я. Гіпіуса (перападараны яму ў 2001 г., з нагоды 70-годдзя, З. Мажэйкай). Фота В. Красуліна, 2016

Але Э. Дарашэвіч, як чалавек з сістэмнай базавай філасофскай адукацыяй, заўжды суадносіў даследаваныя ім айчынныя з'явы культуры, навукі і мастацтва з іх сусветным кантэкстам, што метадалагічна дапамагае ў яго тэкстах «бачыць за дрэвамі гай», калі ўжываць такую метафару (кам. 2). А менавіта: даследаваць не асобныя вырваныя з кантэксту другасныя сведчанні-вынікі-наступствы мыслення і паводзін людзей-папярэднікаў і сучаснікаў досыць шырокага асяродка зносін Э. Дарашэвіча, а – кантэкст ды агульны абрыс іх культуры на фоне культур глабальнай супольнасці чалавецтва – абрыс з'яўлення, заканамернасцей існавання і перспектыў дадзеных светапогляду і паводзін.

Чалавек, які ў XXI ст. пасля выкладчыцка-навуковай кар'еры працягласцю ў 6 дзесяцігоддзяў у амаль 90-гадовым узросце меў рэгулярны кантакт і абмен навінамі (праз skype) з жыхарамі 3 кантынентаў (Еўропа, Азія, Паўночная Амерыка), а таксама чытаў лекцыі он-лайн для студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы (пакуль загадчыкам кафедры сацыялогіі быў філосаф Валянцін Гліна), кіраваў навуковымі даследаваннямі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУКМ, ГрДУ, РІВШ БДУ, відавочна назапасіў сапраўды адмысловы жыццёвы і навуковы досвед, а таксама інтэлектуальную спадчыну, вартыя ўвагі ды дэталёвага аналізу.

Як бачым, у розныя часы ў шэрагу навуковых прац Э. Дарашэвічам быў «разабра́ны» па этапах (хаця б на ўзроўні «абрысу», а часам – з відавочнай тэндэнцыяй да «паглыблення») фактычна ўвесь «акультураны» антрапагенез (перыяд, распачаты ад з'яўлення чалавека разумнага = homo sapiens – каля 350–300 тыс. гадоў  таму – улічваючы знаходкі ў мараканскім Джэбель-Ірхуд [3]), калі «*агульнапрынятыя ў межах пэўнай супольнасці формы арганізацыі мыслення і паводзін*» (= «к у л ь т у р а» [2, с. 26 ]) сталі дамінаваць над інстынктамі, светаадчуваннем і дзеяннямі чалавека як неакультуранага біялагічнага віда, а таксама жорстка весці яго скрозь час і прастору (таб. 1). Спадзяемся, самавітасць, а таксама якасць дадзенага храналагічнага зрэзу не застануцца па-за ўвагай тых, хто будзе мець намер сур'ёзна пазнаёміцца з patrimonio intellettuale чалавека, які, на вялікі жаль усіх, хто ведаў яго, пакінуў нас у бягучым годзе. Пакінуў «сам на сам» з далёкім / блізкім, якое ён меў талент наблізіць/аддаліць, зрабіць аглядным,  зразумелым, адчувальным, а таму – не пачварным ды не выклікаючым небяспеку.

Тое, што Э. Дарашэвіч заканамерна прайшоў у, так бы мовіць, «самавітай даследчыцкай форме» (мал. 9) ад вывучэння акалічнасцей еўрапейскай філасофіі, персаналій гуманістаў і асветнікаў Беларусі да штудый менавіта спадчыны культуры вуснай традыцыі сваёй Радзімы,  не дзіўна. Верны свайму прызванню гісторыка навукі, ён заўжды быў «у трэндзе», калі ўлічыць, што на мяжы тысячагоддзяў падобныя думкі выказваў цэлы шэраг сусветна прызнаных «зорак» навукі, прычым, абсалютна аддаленых ад фалькларыстыкі. Напрыклад, кембрыджскі прафесар антрапалогіі і археалогіі сэр Джон Грэхем Дуглас Кларк (1907–1995), аўтар бліскучага фундаментальнага выдання «Сусветная протагісторыя : абрыс» [9]. Апошні сцвярджаў: «Шмат з усеагульнай памяці чалавецтва… было "ўбудавана" у структуру грамадства…, знайшло ўвасабленне ў сродках вытворчасці, але вялікая роль належыць в у с н а й   т р а д ы ц ы і. ‹…› Яна служыць адразу дзвюм мэтам: зліць у адно рэчышча наяўныя сёння традыцыі грамадства з духоўнай спадчынай продкаў, а таксама – абудзіць пачуццё яднання, дух супольнасці ў тых, да каго гэта вусная традыцыя накіравана. ‹…› Большасць палітычных і культурных устанаўленняў сучаснага свету абавязаны сваім існаваннем дасведчанасці чалавека ва ўласным мінулым» [9, с. 314]. Таму  канцэптуальна-парадыгмальныя творы Э. Дарашэвіча, асабліва «Тэорыю фальклору», варта яшчэ раз перачытаць (ці прачытаць) усім жыхарам краіны, у кожным разе, тым, хто лічыць сябе, як казалі нашыя продкі, «паспалітым» (цывілізаваным, сацыялізаваным і інкультураваным) чалавекам.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Табліца 1 – Храналагічны зрэз даследавання з'яў культуры ў асноўных манаграфіях Э. Дарашэвіча

| Час | | Графічнае адлюстраванне храналогіі даследаваных падзей у манаграфіях са спасылкамі на выданні | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| маштабі-раванне | храналогія | «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» | «Анталогія педагагічнай думкі БССР» | «Культурная спадчына» | «Тэорыя фальклору» |
| | | а менавіта – ва ўзгаданых у цытатах з дадзеных кніг – наступных лічбах | | | |
| | | X ст. – пач. XX ст. [5, с. 22; с. 302] | 1130 г. – 1978 г. [6, с. 10; с. 382, 453] | III/II тыс. да н. э. – 2000 г. [6, с. 36–42; с. 145] | 350 тыс. да н. э. – 2011 г. [4, с. 13; с. 55–58] |
| 1 000 гадоў | III тыс. н. э. | | | | |
| | II тыс. н. э. |     |   |   |   |
| | I тыс. н. э. | | |  |  |
| 100 000 гадоў | 100 тыс. да н. э. | | | |   |
| | 200 тыс. да н. э. | | | |  |
| | 300 тыс. да н. э. | | | |  |
| | 400 тыс. да н. э. | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апошняя кніга прафесара Э. Дарашэвіча «М а е ў с п а м і н ы» пабачыць свет цягам 2021 года. Яе вельмі чакаюць яго сябры, калегі і вучні, для якіх Энгельс Дарашэвіч назаўжды застанецца прыкладам самаадданасці адвечным каштоўнасцям навукі, духоўнасці, справядлівасці і сапраўднага патрыятызму.

**Каментарыі:**

1. Праз асабісты жыццёвы досвед, а таксама досвед сваёй сям'і Э. Дарашэвіч быў вельмі дэтальна знаёмы з такімі з'явамі, як: Варшаўская бітва (польск. 'cud nad Wisłą'); «масавая калектывізацыя» БССР; эвакуацыя, халакост, мінскі антыфашыскі рух і Сталінградская бітва падчас II Сусветнай вайны; антысемітызм, сталінізм, пераследы дысідэнтаў і іншадумцаў, дээтнізуючы і рэгрэсіўны кантроль айчыннай навукі спецслужбамі СССР; «парад суверэнітэтаў» і яго наступствы; эміграцыя постсавецкіх інтэлектуалаў і асаблівасці іх адаптацыі на Захадзе; наступствы для навуковай супольнасці з'яўлення інфармацыйнага грамадства і глабалізацыі; лёс традыцыйнай культуры і яе абаронцаў-навукоўцаў на постсавецкай прасторы і г. д.
2. Пра даследаванні фальклору, пераважаючыя ў асяродку т. зв. «вузкіх спецыялістаў», у 1997 г. у прэніях наладжанай БелІПК (Беларускім інстытутам праблем культуры – установай, створанай на хвалі тагачаснай беларусізацыі культуролагам і музыкам У. Скараходавым) VI Еўрапейскай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV) «Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы» [7] выказаўся запрошаны з Нямеччыны фалькларыст, а таксама адзін з актывістаў IOV Ёрг Рап [7, с. 102–104]: «Ноты, фота, песні, танцы, казкі… Вельмі добра, але – дзе светапогляд, міфалогія, архетыпы, глыбінныя культурныя сэнсы і стэрэатыпы?... Чаму мы за *дрэвамі* не бачым г а ю?».

**Спіс літаратуры:**


1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / ред. колл. Э. Дорошевич, М. Мятельский и др. – М. : Педагогика, 1986. – 460 с.
2. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард. – Мінск : Тэхналогія ; Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 478 с. ; іл.
3. Гош, П. Homo sapiens появился на 100 тысяч лет раньше, чем считалось ранее / Паллаб Гош // Bbc.com [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.bbc.com/russian/features-40197707. – Дата доступу : 08.04.2020.
4. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Энгельс Дарашэвіч. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с. : іл.
5. Дорошевич, Э. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Энгельс Дорошевич, Владимир Конон. – М. : Искусство, 1972. – 319 с.
6. Культурная спадчына : Культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні / Э. Дарашэвіч, Ул. Конан і інш. ; уклад, нав. рэд. і аўт. прадм. – праф. Э. Дарашэвіч – Мінск : ВТАА «Сучаснае слова», 2001. – 168 с.
7. Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы : Матэрыялы VI Еўрапейскай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV) (23–24.09.1997, Мінск). – Мінск : БелІПК, 2001. – 110 с.
8. Тагор, Р. Гитанджали : Жертвенные песнопения = Gitanjali : Song Offerings / Рабиндранат Тагор ; худ. Г. Поплавский. – Минск : Маст. літ., 2006. – 135 с.
9. Clark, G. World Prehistory : An Outline / Grahame Clark. – Cambridge : Cambridge University Press, 1972. – 319 с.



***Евгений Руцкий***


## БИОГРАФИЧЕСКОЕ ИССЛЕДОВАНИЕ ЖИЗНИ ПРОФЕССОРА ЭНГЕЛЬСА ДОРОШЕВИЧА (*1931–2020*)


*Статья основана на интервью, взятом автором у белорусского учёного Энгельса Дорошевича в 2012 году. Она посвящена обстоятельствам, в которых Э. Дорошевич сформировался как личность, а также как чуткий и эрудированный исследователь истории отечественной науки, оригинальный философ, признанный теоретик культуры и фольклора.*



***Evgeny Rutsky***


## BIOGRAPHICAL RESEARCH OF THE LIFE OF PROFESSOR ENGELS DOROSHEVICH (*1931–2020*)


*This article is based on an interview taken by the author of the Belarusian scientist Engels Doroshevich in 2012. This article is devoted to the circumstances in which E. Doroshevich was formed as a person, as well as a sensitive and erudite researcher of the history of science, philosopher, theorist of culture and folklore.*


***Введение.*** Данная публикация имеет в своей основе интервью, которое было взято мной у белорусского философа, культуролога и педагога Энгельса Дорошевича в 2012 г. Оно потребовало 5 встреч, в ходе которых было сделано около 12 часов аудиозаписей. Я перевел их в текстовый формат, систематизировал и снабдил своими ремарками. Часть повествования была переработана с целью лучшей подачи, часть – приводится в виде точных закавыченных цитат. С одной стороны, получился автобиографический монолог, с другой – биографическое исследование, полное взаимоотношений героя со средой и эпохой. Я публикую эту работу в знак доброй памяти о профессоре Э. Дорошевиче, но читателям, возможно, не совсем ясно, зачем так скрупулёзно погружаться в детали. История, однако, актуальна тем, что ее можно помнить и рефлексировать. Даже в самом частном виде она способна быть репрезентативной и поучительной, поэтому все зависит от того, как читатель выстраивает с ней собственные взаимоотношения.

***Происхождение, семья, имя, раннее детство.*** В современную эпоху не всегда возможно понять, в какой степени человека способно детерминировать его происхождение, однако и игнорировать эту сторону не стоит. Мать Э. Дорошевича, Ревекка Израилевна Дорошевич (в девичестве – Раскина), родилась в 1905 г. в крестьянской семье в д. Очесо-Рудня Гомельской области. Дедушка был стекольщиком, бабушка – домработницей. Помимо матери в семье было ещё три брата. Ревекка окончила медицинский факультет Московского университета и стала врачом-специалистом по промышленной санитарии. Отец, Дорошевич Константин Михайлович, родился в 1896 г. в д. Ходосы Новогрудского района. Его семья была чисто крестьянская, однако известно, что она принимала участие в сплавке леса по р. Неман, плоты с которым гнали до Кёнигсберга. К. Дорошевич ушел добровольцем на Первую мировую войну. Затем некоторое время жил


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ